ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

Аддзел бібліятэказнаўства

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Інфармацыйнае паведамленне

САКАВІК – КРАСАВІК

Віцебск 2016

ДУ “ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА”
Аддзел бібліятэказнаўства

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Сакавік – красавік

Інфармацыйнае паведамленне

ВІЦЕБСК
2016

УДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К90

Складальнік *А. М. Васілеўская*
Адказны за выпуск *Т. М. Адамян*

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці : сакавік–красавік : інфармацыйнае паведамленне / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел бібліятэказнаўства ; [склад. А. М. Васілеўская]. – Віцебск, 2016. – 22 с.

Штомесячнае інфармацыйнае паведамленне разлічана на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначана для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна», 2016

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Сакавік – красавік

Інфармацыйнае паведамленне

Складальнік **Васілеўская** Алена Мікалаеўна

Адказны за выпуск Т. М. Адамян

Камп'ютарная вёрстка А. В. Юпатавай

Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна»

210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а

E-mail: metodic@vlib.by, vlib@vlib.by

ПРАДМОВА

«Культурнае жыццё Віцебскай вобласці» – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка «Хроніка падзей» уключае тэкставыя вытрымкі і аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную на аснове публікацый з гарадскіх, раённых газет Віцебскай вобласці і іх электронных версій за перыяд з 1 сакавіка па 30 красавіка 2016 года. «Хроніка падзей» таксама ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя Віцебскім АМЦНТ, Браслаўскай, Віцебскай, Гарадоцкай, Дубровенскай, Лепельскай, Лёзненскай, Міёрскай, Пастаўскай, Полацкай, Сенненскай, Ушацкай, Чашніцкай, Шаркаўшчынскай, Шумілінскай раённымі сеткамі бібліятэк, Віцебскай і Наваполацкай гарадскімі сеткамі бібліятэк.

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

КУЛЬТУРА

АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

17 сакавіка адбылася дваццаць другая сесія Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў 27-га склікання. На сесіі было разгледжана пытанне "Рэалізацыя асноўных напрамкаў Закона Рэспублікі Беларусь «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь» у Віцебскай вобласці". Сярод агучаных праблем было адзначана, што павышанай увагі патрабуюць аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны. На сесіі выступіў дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь *А. Цацоха*, які адзначыў, што наша краіна першай на постсавецкай прасторы прымае "Кодэкс аб культуры", у якім будуць сабраны ўсе заканадаўчыя акты, што адносяцца да гэтай галіны.

Витебские вести. – 2016. – 19 марта. – С. 2.

На пасаду начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама назначаны *Генадзій Міхайлавіч Ягораў.* Адпаведнае распараджэнне **24 сакавіка** падпісаў кіраўнік вобласці.

http://www.vitbichi.by/news/politika/post8173.html

Ганаровай граматай Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў за шматгадовую добрасумленную работу і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Віцебскай вобласці ўзнагароджаны *Аляксандр Аляксандравіч Старых* – дырэктар ДУ "Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа".

Витебские вести. – 2016. – 21 апр. – С. 4.

28 красавіка ў ЦГБ імя М. Горкага адбылася ўрачыстая

ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

У **красавіку** ў абласным цэнтры адбыліся гастролі сцэнічнага калектыва з Расіі – Арлоўскага дзяржаўнага тэатра для дзяцей і моладзі "Свободное пространство". Аснову рэпертуара склалі як новыя пастаноўкі, так і пастаноўкі мінулых гадоў, што прыйшліся даспадобы віцебскаму гледачу: мюзікл па матывах твораў І. Бабеля "Биндюжник и король", музычная камедыя "Ханума" А. Цагарэлі, казка для ўсёй сям'і "Африка" У. Любага і інш.

19 сакавіка ў тэатры "Лялька" адбыўся канцэрт і прэм'ерны паказ спектакля "Умка" з мэтай папулярызацыі міжнароднай экалагічнай акцыі "Час Земли".

21–25 сакавіка Беларускі тэатр "Лялька" прымаў удзел у II Міжнародным фестывалі тэатра лялек "Преданья старины глубокой", які прайшоў у г. Тамбове (Расійская Федэрацыя). Гледачы ўбачылі японскую казку пра каханне – спектакль "Волшебное оружие Кэндзо" (М. Супонін, пастаноўка В. Клімчука).

22 красавіка Беларускі тэатр "Лялька" адзначыў трыццаты год нараджэння. У праграме свята: выстаўка ў краязнаўчым музеі, канцэрт духавога аркестра, юбілейны капуснік "Нам 30 лет".

http://lialka.by/rus/news/

25–26 красавіка на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа прайшоў гарадскі конкурс "Сценические чтения "Школьный театр-20". Гран-пры ўдастоены школьны тэатр гімназіі № 1 за спектакль "Премьера" па аднайменным апавяданні Р. Брэдберы.

http://kolastheatre.by/ru/news/shkolnyy-teatr-na-etot-raz-yubileynyy

Аршанскай гарадской галерэі В.В. Грамыкі (графіка, жывапіс). Арганізатары: музейны комплекс гісторыі і культуры Аршаншчыны, Аршанская гарадская мастацкая галерэя В.В. Грамыкі і Смаленская арганізацыя саюза мастакоў Расіі.

http://www.orshanka.by/?p=30102

ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА

З 24 лютага па **11 сакавіка** ў выставачнай зале ДУ "Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" працавала выстава работ народных клубаў майстроў і самадзейных мастакоў Верхнядзвінскага раённага Дома рамёстваў і "Святліца" Міёрскага раённага Дома культуры.

Віцебскі АМЦНТ

З **16** па **8 красавіка** ў выставачнай зале Віцебскага АМЦНТ экспанавалася выстава "Палітра талентаў" народнага клуба майстроў і самадзейных мастакоў "Крыніца" Глыбоцкага Цэнтра традыцыйнай культуры і народнай творчасці.

Віцебскі АМЦНТ

З **13** па **29 красавіка** ў выставачнай зале ДУ "Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" працавала выстава народнай творчасці майстроў Смаленшчыны "Смаленшчына майстровая" ў межах культурнага абмену. На выставе экспанаваліся работы 23 мастакоў і майстроў з пасёлкаў Прыгорскае і Верхнядняпроўскі, гарадоў Смаленска і Ярцава, а гэта больш за 170 экспанатаў. У межах адкрыцця выставы было падпісана пагадненне аб культурным супрацоўніцтве паміж Віцебскім абласным метадычным цэнтрам народнай творчасці і Смаленскім абласным цэнтрам народнай творчасці. Добры настрой усім прысутным на адкрыцці выставы падарыў народны фальклорны ансамбль "Талан" з горада Смаленска. У лістападзе майстры з Віцебшчыны прадставяць свае работы на гасцінай Смаленскай зямлі.

Віцебскі АМЦНТ

цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў "Літаратурнай прэміі імя Петруся Броўкі" Віцебскага аблвыканкама. Лаўрэатамі прэміі за 2015 год сталі:

– у намінацыі "проза" – *Віктар Васільевіч Улюценка* (творчы псеўданім Антон Параскевін);

– у намінацыі " паэзія" – *Кацярына Мар'янаўна Сосна*;

– у намінацыі "літаратура для дзяцей" – *Маіна Максімаўна Бабарыка.*

http://cbsvit.by/

КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ

З узнагародамі вярнуліся з Міжнароднага конкурсу-фестывалю мастацваў "Музыки свет" (**11–14 сакавіка**) вакальная група "Форте" Цэнтра культуры г. Наваполацка (кір. *С. Трубіна*). Мінскі форум адбыўся ўпершыню і ўдзел у ім прынялі прафесійныя і аматарскія калектывы з Беларусі, Арменіі, Англіі і Індыі. У творчым спаборніцтве ўдзельнічалі тры саліста з Наваполацка, і ўсе яны ўвайшлі ў лік пераможцаў ў намінацыі "Эстрадны вакал, сола". Дыпломамі II ступені ўзнагароджаны васьмігадовая *Соф'я Палякевіч* і чатырнаццацігадовы *Ігнацій Баранаў*, яго равесніца *Ганна Скрыпко* атрымала дыплом III ступені.

Витебские вести. – 2016. – 24 марта. – С. 5.

Навапалачанка *Марыя Сеганкевіч* з эстраднай студыі "8-я нота" (кір. *С. Барыла*) перамагла на VI Міжнародным фестывалі-конкурсе "Славянскі карагод" у намінацыі "Эстрадны вакал", які праходзіў **19–20 сакавіка** ў Смаленску.

Витебские вести. – 2016. – 29 марта. – С. 8.

Пяць дыпломаў прывезлі з Чэхіі навучэнцы наваполацкай дзіцячай мастацкай школы імя І. Хруцкага. Юныя мастакі ўдзельнічалі ў Міжнародным фестывалі-конкурсе "ART-PANORAMA-2016", які прайшоў **22–26 сакавіка**. У праграму творчага спаборніцтва ўваходзілі пленэр і майстар-клас чэшскага мастака *М. Сандорава*. Па выніках пленэру жывапісец выбраў лепшую вучнёўскую работу, яе аўтарам стала *Ксенія Цвяцінская* з г. Наваполацка. У гэтым годзе навучальная ўстанова з Наваполацка прызнана лепшай – ёй уручаны кубак пераможцы. Пяць

юных аўтараў атрымалі дыпломы: *Валерыя Смірнова, Паліна Ласякіна* і *Маргарыта Косцель* – першай ступені, *Ксенія Цвяцінская* і *Лідзія Камыніна* – другой.

Витебские вести. – 2016. – 23 апр. – С. 16.

Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Віцебскам і муніцыпальным ўтварэннем Белаярскі раён Ханты-Мансійскай аўтаномнай акругі – Югры (Цюменская вобласць, Расійская Федэрацыя) падпісана **23 сакавіка** ў Віцебскім гарвыканкаме.

Витебские вести. – 2016. – 24 марта. – С. 1.

Ансамбль танца, музыкі і песні абласной філармоніі "Талака" прыняў удзел у святкаванні Дзён беларускай культуры ў Францыі ў **сакавіку**. Віцебскія артысты выступілі ў Парыжы і Ліёне, дзе прадставілі вакальныя і інструментальныя нумары са свайго рэпертуару. Кіраўніку калектыву *М. Падаляку* быў уручаны дыплом-удзячнасць Пасольства Беларусі ў Францыі.

Витебские вести. – 2016. – 28 апр. – С. 23.

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА. САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

КЛУБНАЯ СПРАВА

У **сакавіку** ў рамках акцыі "Жыццё без наркотыкаў" у Аршанскім гарадскім Цэнтры культуры "Перамога" адбылася прэм'ера спектакля "Нас нет" па матывах п'есы Т. Далговай "Звезда над крышей" у выкананні акцёраў народнага гарадскога тэатра.

Аршанская газета. – 2016. – 26 сакавіка. – С. 4.

24–27 сакавіка ў Оршы прайшоў **Міжнародны адукацыйны фестывальна-конкурсны праект сучаснага мастацтва і крэатыўнай творчасці "Апельсінавая бяроза"**. Калектыў ДУ "Цэнтр культуры «Віцебск»" студыя сцэнічнага майстэрства "Арт-праект" атрымаў наступныя ўзнагароды: дыплом лаўрэата I ступені ў намінацыі

рамках фэсту прайшоў шэраг аглядных і тэматычных экскурсій з удзелам мастацтвазнаўцаў, гісторыкаў і студэнтаў ВДУ імя П.М. Машэрава.

http://www.vitbichi.by/news/kultura/post8452.html

Адрэзак вуліцы "Праўды" – паміж вуліцамі Леніна і Калініна – перайменаваны і названы ў гонар нашага земляка, беларускага і французскага мастака Марка Шагала. Рашэнне аб гэтым было прынята Віцебскім гарадскім Саветам дэпутатаў **28 сакавіка**, а ўступіла ў сілу пасля апублікавання яго **9 красавіка** на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале Рэспублікі Беларусь.

http://www.vitbichi.by/news/obshchestvo/post8346.html

МАСТАЦТВА

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

У Мастацкім музеі Віцебска ў **сакавіку** адкрылася экспазіцыя "Берега", прымеркаваная да 75-годдзя майстра акварэлі *Ф. Гумена*.

Витебские вести. – 2016. – 29 марта. – С. 8.

У Арт-цэнтры Марка Шагала ў **сакавіку** экспанавалася выстаўка гістарычнай фатаграфіі "Соловейчик – Августис. Начало и конец эпохи", на якой прадстаўлены здымкі Беластока двух фатографаў з розніцай у чатыры дзесяцігоддзі. Экспазіцыя адбылася дзякуючы падтрымцы Польскага інстытута ў Мінску.

Витебские вести. – 2016. – 22 марта. – С. 8.

7 красавіка ў Мастацкай галерэі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка адкрылася выстаўка работ польскага мастака і дзеяча культуры *Анджэя Струмілы* "Театралия" (эскізы касцюмаў, дэкарацыі да спектакляў, афішы, фатаграфіі, элементы афармлення), арганізаваная ў рамках праекта прэзентацыі польскай культуры ў Беларусі.

Витебские вести. – 2016. – 5 мая. – С. 18.

Маладыя мастакі з розных гарадоў краіны і Расіі адзначылі Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі адкрыццём міжнароднай выстаўкі ў

17 сакавіка ў абласным цэнтры ўпершыню адсвяткавалі дараванне гораду Магдэбургскага права. У гонар свята ў ратушы адбыліся лекцыі і экскурсіі, а ў КЗ "Віцебск" **18 сакавіка** прайшла прэзентацыя праекта "Витебская хоругвь" клуба гістарычнай рэканструкцыі "Варгенторн" з выступленнямі і канцэртам групы "Стары Ольса".

Витебские вести. – 2016. – 15 марта. – С. 5.

У Мастацкім музеі Віцебска адкрылася выстаўка работ *Рамана Заслонава* "Мои образы из театра" – вядомага беларускага жывапісца і ўнука легендарнага партызанскага камандзіра (мастак жыве ў Францыі).

Витебские вести. – 2016. – 10 марта. – С. 23.

Сенненскі гісторыка-краязнаўчы музей у рамках Года культуры распачаў праект "Вечера в музее. Встречи с интересными людьми". Першым госцем стала актрыса Нацыянальнага драматычнага тэатра імя Я. Купалы *Кацярына Алейнікава*, выканаўца галоўнай ролі ў п'есе класіка беларускай літаратуры "Паўлінка".

Витебские вести. – 2016. – 28 апр. – С. 24.

18 сакавіка ў рамках навукова-асветніцкага марафона, прысвечанага Першай сусветнай вайне, у Паставах стартавалі міжнародныя чытанні "История во имя мира". Арганізатарам мерапрыемства выступіў Пастаўскі райвыканкам. Акунуцца ў падзеі 100-гадовай даўніны ўдзельнікам чытанняў дапамаглі фотавыстаўкі "Великая война без ретуши", "Лынтупщина на немецких открытках Первой мировой войны". Падчас мерапрыемстваў была адкрыта мемарыяльная дошка на набярэжнай ракі Мядзелка.

Витебские вести. – 2016. – 24 марта. – С. 3.

23–24 красавіка Віцебск далучыўся да акцыі "Фэст экскурсаводаў". Адметнасцю сёлетняга фэста з'явіўся актыўны ўдзел дзяржаўных устаноў культуры ў фармаванні спіса экскурсій. Упершыню шматлікія віцебскія музея адкрылі дзверы для наведнікаў фэста і распавялі пра гісторыю музейных будынкаў, існуючыя экспазіцыі і свае планы. У

"Тэатральнае мастацтва, драматычны спектакль" за спектакль па матывах беларускіх народных казак "Кісель"; дыплом лаўрэата III ступені ў намінацыі "Тэатральнае мастацтва, музычна-пластычны спектакль" за спектакль па матывах твора Д. Хармса "Дворык"; дыплом за лепшую рэжысуру ў намінацыі "Тэатральнае мастацтва" – *М. Няменаву* за спекталь па матывах беларускіх народных казак "Кісель"; дыплом за лепшую мужчынскую ролю ў намінацыі "Тэатральнае мастацтва" – *У. Абраменку* за ролю Васіля ў спектаклі па матывах беларускіх народных казак "Кісель"; дыплом за касцюмы ў намінацыі "Тэатральнае мастацтва" – дызайнеру студыі *Т. Куляшовай*, кіраўніку студыі *А. Ерушэвіч-Стаброўскай* і рэжысёру *М. Няменаву* за спектакль па матывах Д. Хармса "Дворык".

http://www.gck.by/2016/04/10285

30 сакавіка ў Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці адбыўся семінар дырэктараў і спецыялістаў Дамоў (Цэнтраў) рамёстваў вобласці. На семінары былі агучаны задачы раённых Дамоў рамёстваў падчас правядзення святаў-праектаў АМЦНТ, якія пройдуць у межах XXV Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску".

Віцебскі АМЦНТ

У рамках мерапрыемстваў, прысвечаных Дню яднання народаў Беларусі і Расіі ў гарадах Орша і Барань адбыліся выступленні Еманжалінскага муніцыпальнага рускага аркестра народных інструментаў "Садко" (Чалябінская вобласць, Расійская Федэрацыя).

Аршанская газета. – 2016. – 7 крас. – С. 3.

16 красавіка ў Наваполацку адбыўся I гарадскі фестываль-конкурс харэаграфічнай творчасці "Танцующий город". Ініцыятарамі мерапрыемства выступілі аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі, аддзел адукацыі, спорту і турызму Наваполацкага гарвыканкама, гарадскія арганізацыі – прафсаюз работнікаў адукацыі і навукі, БРСМ. Удзельнікамі сталі навучэнцы ўстаноў адукацыі і культуры. Выступленні ацэньваліся па пяці намінацыях: народна-сцэнічны, народна-

этнічны, эстрадны, класічны і бальны танец.

16 красавіка ў Полацку ля памятнага знака літары “Ў” палачане і госці горада далучаліся да беларускага фальклору. Выступленнем фальклорнага ансамбля “Карусель” дзіцячай школы мастацтваў Полацкага раёна быў адкрыты культурны праект “Вулічны музыка-2016”. Па суботах і нядзелях на цэнтральным праспекце горада будуць ладзіцца канцэрты пад адкрытым небам, літаратурныя дэбаты, тэатралізаваныя паказы.

http://www.pvestnik.by/?p=27044

20 красавіка ў выставачнай зале “Духаўскі круглік” адбылася прэс-канферэнцыя, прысвечаная пытанням падрыхтоўкі XXV Міжнароднага фестывалю мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску”. Беларусь на песенным конкурсе прадставіць вакаліст *Аляксей Грос*. На XIV Міжнародным дзіцячым музычным конкурсе прадстаўляць нашу краіну будзе мінчанка *Анастасія Жабко*.

http://www.gck.by/2016/04/10320

ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ

12 сакавіка ў аграгарадку Ноўка Віцебскага раёна і **19 сакавіка** ў г. п. Ушачы адбыўся **абласны конкурс клубаў “Ветэран”** і **ветэранскіх творчых калектываў “Не старэюць душой ветэраны”, прысвечаны Году культуры**. Конкурс праходзіў у межах XIII Рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў, заключныя мерапрыемствы якога адбудуцца ў г. Мінску 5–6 мая. У конкурсе прынялі ўдзел больш за 45 калектываў і 40 індывідуальных выканаўцаў у розных жанравых напрамках, аб'яднаных тэмай роднага краю і Вялікай Айчыннай вайны. Па выніках конкурсу звання “Гран-пры” ўдастоены народны хор Зубаўскага сельскага дома культуры Аршанскага раёна і народны хор ветэранаў Полацкага гарадскога Палаца культуры. У намінацыі “Сольныя спевы” звання лаўрэата I ступені ўдастоены *Валянціна Скарадуля* (г. Орша) і *Анатоль Пашчанка* (г. Полацк).

Віцебскі АМЦНТ

ДУК “Чашніцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

20 красавіка Семінар бібліятэчных работнікаў раёна “Год культуры ў Беларусі: прывабная бібліятэка – імідж, запатрабаванасць, новы фармат” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

25 красавіка Раённы конкурс самадзейных паэтаў і чытальнікаў “Дарогамі Янкі Журбы”, прысвечаны 135-годдзю паэта-земляка (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

ДУК “Шаркаўшчынская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

1 сакавіка ў *цэнтральнай раённай бібліятэцы* адбылося мерапрыемства, прысвечанае Дню барацьбы з наркаманіяй і наркабізнесам з удзелам інструктара-валеолага раённага Цэнтра гігіены і эпідэміялогіі *А.М. Курачонак* і старшага інспектара інспекцыі па справах непаўналетніх Шаркаўшчынскага РАУС *І.І. Пачкоўскага*.

21 сакавіка Акцыя да Міжнароднага дня паэзіі “Кошык поўны вершаў” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

21 красавіка Семінар бібліятэчных работнікаў раёна “Да душы сваёй знайдзі дарогу: работабібліятэк па духоўна-маральным выхаванні чытачоў, заснаваным на праваслаўных традыцыях”. У рамках семінара адбылася сустрэча з настаяцелем храма Успення Прасвятой багародзіцы протаіерэем *Пятром Бараноўскім* (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

ДУК “Шумілінская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

7 красавіка Выязное паказальнае мерапрыемства ў царкве Пакрова Прасвятой Багародзіцы “Тропа к духовным родникам” (*Мішкаўская сельская бібліятэка*).

27 красавіка Забаўляльна-пазнавальная праграма “Ад усёй душы” для людзей стала ўзросту з удзелам членаў народнай літаратурна-музычнай гасцёўні “Крыніца” (*Кардонская сельская бібліятэка*).

удзелам благачыннага Міёрскага благачыння протаіерэя *В. Вабішчэвіча* (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

ДУК “Пастаўская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

6 сакавіка Творчая сустрэча з паэтэсай *М. Кавалёнак* “У палоне вясны” з удзелам самадейных паэтаў і вучняў Варапаеўскай школы мастацтваў (*Варапаеўская гарпасялковая бібліятэка*).

ДУК “Полацкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

15 красавіка Прэстыж-сустрэча “Адкрыццё прафесіі” з інспектарам групы прапаганды і ўзаемадзеяння з грамадскасцю Полацкага ГРАНС *Т.С. Шаўлюгай* (*дзіцячая бібліятэка імя Л.М. Талстога*).

22 красавіка Сустрэча з ліквідатарам наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС *Віктарам Георгіевічам Станкевічам* (*Сільніцкая сельская бібліятэка-музей этнаграфіі*).

ДУК “Сенненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

30 сакавіка Прэзентацыя паэтычнага зборніка “Сенненщина синеокая” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

ДУК “Ушацкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

У **красавіку** ў бібліятэках сістэмы адбыліся наступныя мерапрымствы: вандроўка “Книга, дети всем нужна, учит мудрости она” (*дзіцячая раённая бібліятэка*), конкурс слоганаў “Быть здоровым, жить активно – это стильно, позитивно!” (*Вялікадолецкая сельская бібліятэка*), вечар памяці “Балючая памяць Беларусі” (*Вяркудская сельская бібліятэка*) і інш.

ДУК “Талачынская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

З **23 сакавіка** ў новым фармаце пачаліся конкурсныя прагляды **абласнога свята “Тэатральная вясна-2016”,** прысвечанага Году культуры. Кожны калектыў і ўдзельнік праглядаецца членамі абласнога журы і гледачамі на сваёй роднай сцэне. У конкурсе прымаюць удзел 20 аматарскіх тэатраў вобласці. Свята доўжыцца да канца **красавіка**. Па выніках конкурсных праглядаў у канцы мая будзе вызначаны пераможца.

Віцебскі АМЦНТ

З **24 сакавіка** па **27 красавіка** праходзіў **XXIX Міжнародны фестываль старажытнай і сучаснай камернай музыкі** ў Сафійскім саборы. Вядомыя майстры выканальніцкага майстацтва з Расіі, Аўстрыі, Польшчы, Кітая, Літвы, Эстоніі і Беларусі сталі ўдзельнікамі фестывальных канцэртаў.

http://ximik.info/news/24-marta-startuet-xxix-mezhdunarodnyy-festival-starinnoy-i-sovremennoy-kamern

26–27 сакавіка ў Віцебску адбыўся **XXII Міжнародны фестываль**, прымеркаваны да яўрэйскага свята Пурымшпіль. Сваю творчасць у час фестывалю прадставілі каманды з Бірабіджана, Гомеля, Мінска і Масквы.

Витебские вести. – 2016. – 31 марта. – С. 23.

На працягу **сакавіка–красавіка** на Віцебшчыне праходзіў **абласны агляд-конкурс мастацкай самадзейнасці аматарскіх калектываў вобласці “Беларусь на шляху да культуры свету”**, прысвечаны Году культуры. У аглядзе-конкурсе прынялі ўдзел больш 5000 чалавек, а гэта каля 500 калектываў і 200 індывідуальных выканаўцаў з усіх рэгіёнаў Віцебшчыны (прадстаўнікі працоўных калектываў прадпрыемстваў і арганізацый, устаноў культуры і адукацыі). Гала-канцэрт мастацкай самадзейнасці творчых калектываў і выканаўцаў Віцебскай вобласці адбудзецца **20 мая** ў Летнім амфітэатры г. Віцебска.

Віцебскі АМЦНТ

5 красавіка ў г. Оршы прайшоў **гала-канцэрт абласнога конкурсу маладых выканаўцаў патрыятычнай песні “Песні юнацтва**

нашых бацькоў”. Гран-пры быў прысуджаны вакальнаму ансамблю “Лаурыта” з г. Наваполацка (намінацыя “вакальны ансамбль”). Першыя месцы атрымалі – у намінацыі “вакальны ансамбль”: вакальны ансамбль “Fusion” УА “Віцебскі дзяржаўны каледж культуры і мастацтваў”, у намінацыі “саліст-вакаліст”: *Юлія Валер'еўна Кудлакова* (г. Орша) і *Яўгенія Віктараўна Авяр'янава* (г. Лепель).

Віцебскі АМЦНТ

БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА

З **30 сакавіка** па **1 красавіка** ў ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна” адбыўся трохдзённы абласны семінар дырэктараў раённых і гарадскіх сетак публічных бібліятэк “Публічныя бібліятэкі Віцебскай вобласці: рэгіянальныя асаблівасці і прыярытэты развіцця”.

ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна”

9 сакавіка Літаратурна-музычная вечарына “Веры тонкая свеча...”, арганізаваная сумесна з бібліятэкай імя А.П. Сапунова Віцебскай праваслаўнай духоўнай семінарыі.

21 сакавіка Адкрыццё выставы дзіцячай творчасці “Палітра дзяцінства” (у рамках бібліятэчнага праекта “Адлюстраванне”, прысвечанага Году культуры).

24 сакавіка Прэзентацыя серыі кніг “Свет вакол нас” паэта, перакладчыка, публіцыста *М. Пазнякова* (г. Мінск) і сустрэча з прадстаўнікамі Выдавецкага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства “Народная асвета”.

29 сакавіка ў рамках міжнароднага карпаратыўнага праекта “Беларускія смаляне, смаленскія беларусы”, што ажыццяўляецца бібліятэкай Смаленскага дзяржаўнага ўніверсітэта і Віцебскай абласной бібліятэкай, адбыўся круглы стол на тэму “Корпоративные проекты как формат международного сотрудничества библиотек”.

30 сакавіка Прэзентацыя трылогіі “Жартачкі” лаўрэата

ДУК “Дубровенская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

25 сакавіка Вечар паэзіі мясцовай паэтэсы *І. Малчанавай* з удзелам народнага фальклорнага калектыву “Кудзеліца” (*цэнтральная раённая бібліятэка сумесна з РДК*).

5 красавіка Свята кнігі “Приключения на планете Чтения” (*цэнтральная раённая бібліятэка сумесна з РДК*).

25 красавіка Вечар памяці да 30-годдзя Чарнобыльскай трагедыі “Помнить, чтобы не повторилось” (*цэнтральная раённая бібліятэка сумесна з РДК*).

ДУК “Лепельская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

8 красавіка Вечар-сустрэча з беларускім паэтам і бардам *Э. Акуліным* “Мая ісціна” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

27 красавіка тэматычны семінар для сельскіх бібліятэкараў раёна “Традыцыі і інавацыі ў папулярызацыі перыядычных выданняў” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

ДУК “Лёзненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

14 сакавіка Сустрэча з благачынным Лёзненскага благачыння іерэем *В. Пашкевічам*. У мерапрыемстве прынялі ўдзел мясцовая паэтэса *В. Пячонава*, навучэнцы і выкладчыкі дзіцячай школы мастацтваў (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

19 сакавіка Вечар паэтычнага настрою “Влюбленные в поэзию” з удзелам самадзейных паэтаў раёна (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

ДУК “Міёрская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

Да Дня барацьбы з наркаманіяй і наркабізнесам у бібліятэках раёна ў **сакавіку** прайшла прафілактычная акцыя “Наш выбар – свет без наркотыкаў”.

14 сакавіка Вечар-сустрэча “Узыходжанне да духоўнасці” з

Т. Красновай-Гусачэнка (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

30 сакавіка Дзень тэатралізаванай казкі ў рамках праекта “Кніга. Тэатр. Беражлівасць” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

ДУК “Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк”

15 сакавіка Літаратурная сустрэча з пісьменнікамі, членамі Віцебскага абласнога аддзялення ГА “Саюз пісьменнікаў Беларусі” *Галінай* і *Сяргеем Трафімавымі* (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

18 сакавіка Літаратурны вечар “Зброяй сатыры – зброяй праўды”, прысвечаны 120-годдзю з дня нараджэння К. Крапівы (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

29 сакавіка Дзень краязнаўчай бібліяграфіі “Гарадоччына ў сучасным і мінулым” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

З **13** па **20 красавіка** Акцыя “Где здоровье – там успех” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

15 красавіка Выязны семінар бібліятэчных работнікаў “Бібліятэка і выхаванне экалагічнай культуры насельніцтва” на базе *Дубраўскай сельскай бібліятэкі*.

22 красавіка Сустрэча “Престиж профессии. Мифы и реальность” з намеснікам пракурора Гарадоцкага раёна *М.Н. Зіновік* (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

26 красавіка Вечар-рэквіем “Чернобыль в нашей памяти” (літаратурна-музычная гасцёўня культурна-асветніцкага цэнтра “Гарадок”).

ДУК “Докшыцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

19 красавіка Літаратурнае свята “Жыве між намі Крапівенскае слова” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

літаратурнай прэміі імя Кандрата Крапівы, перакладчыка, паэта-сатырыка *Міхася Мірановіча*.

18 красавіка Узнагароджанне ўдзельнікаў фотавернісажу “Прогулка по Витебску: в объективе достопримечательности города”, прымеркаванага да Сусветнага дня помнікаў і гістарычных мясцін.

21 красавіка Прэзентацыя камбінаванай базы даных “Мастакі Віцебшчыны” і адкрыццё выставы “У зорным небе”, прысвечанай памяці віцебскіх мастакоў.

26 красавіка Лекцыя кандыдата біялагічных навук, дацэнта *А. Шчыгельскага* і кандыдата тэхнічных навук, дацэнта, намесніка дэкана механіка-тэхналагічнага факультэта УА “ВДТУ” *В. Патоцкага* “Чорная быль Беларусі”, прымеркаваная да 30-годдзя з дня аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

27 красавіка Адкрыццё фотавыставы “Мой домашний питомец”, сустрэча з супрацоўнікамі Віцебскага прытулку для безнаглядных жывёл.

27 красавіка Вечар-рэквіем “Чернобыль в нашей памяти”.

ДУК “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Віцебска”

17 сакавіка Сустрэча з пісьменнікамі з г. Мінска *М.А. Дзеравянка* і *Я.Я. Батальёнкам* (дзіцячая бібліятэка імя С. Маршака).

18 сакавіка Творчая сустрэча з паэтам, членам Саюза пісьменнкаў Расіі *У. Ермаковічам* (*цэнтральная гарадская бібліятэка імя М. Горкага*).

18 сакавіка Творчая вечарына члена Саюза пісьменнікаў Беларусі М. Намеснікава “Поэзия мир наделяет душой” (*бібліятэка імя І. Крылова*).

23 сакавіка Сустрэча з лаўрэатам абласной літаратурнай прэміі імя П. Броўкі, пісьменніцай С. Гук (*бібліятэка імя Е. Лось*).

4 красавіка Круглы стол “Беларусь і Расія – агульныя карані” з удзелам галоўнага спецыяліста аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Адміністрацыі Кастрычніцкага раёна *В.А. Прусавай* (*бібліятэка імя С. Маршака*).

14 красавіка Сустрэча “Праваслаўная духоўная культура”

(*бібліятэка імя Еўфрасінні Полацкай* сумесна з Віцебскім гарадскім аддзяленнем грамадскага аб'яднання "Цэнтр Праваслаўнай адукацыі прападобнай Еўфрасінні Полацкай").

15 красавіка Літаратурная вечарына-прысвячэнне да 130-годдзя рускага паэта М. Гумілёва "Загадкавы паэт срэбранага века" з удзелам навучэнцаў Віцебскага дзяржаўнага каледжа культуры і мастацваў (мастацкі кіраўнік *Д. Бахталін*) (*цэнтральная гарадская бібліятэка імя М. Горкага*).

20 красавіка Вечарына-рэквіем "Чарнобыль: 30 гадоў пасля трагедыі" (*цэнтральная гарадская бібліятэка імя М. Горкага*).

ДУК "Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Наваполацка"

9 сакавіка Дзень праваслаўнай кнігі з удзелам насельніц Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра (*цэнтральная гарадская бібліятэка імя У. Маякоўскага*).

9 сакавіка Гадзіна духоўнай паэзіі "Сердца наполним святостью" з удзелам наваполацкай паэтэсы *Г. Алескеравай* (*бібліятэка імя С. Маршака*).

21 красавіка "Ноч культурных адкрыццяў" (*цэнтральная гарадская бібліятэка імя У. Маякоўскага*). У рамках мерапрыемства адбылася сустрэча з беларускім сцэнарыстам, публіцыстам, членам Беларускага Саюза кінематаграфістаў, літаратурным рэдактарам часопіса "На экранах" *Юліяй Ляшко*, прайшоў бібліяКВЕСТ, для прыхільнікаў танца і музыкі працавала пляцоўка "DANCE MIX" (з удзелам танцавальных калектываў гарадоў Полацк і Наваполацк), выступленне ансамбля інструментальнай музыкі выкладчыкаў Наваполацкага музычнага каледжа "Свая гульня", флэшмоб "Да здравствует чтение сегодня и всегда!" і інш.

ДУК "Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Браслаўскага раёна"

5 сакавіка Дзень пісьменніка К. Крапівы (*Друйская сельская бібліятэка*).

24 сакавіка Гадзіна духоўнасці "Агеньчык веры" з удзелам настаяцеля Богінскай Свята-Пакроўскай царквы *айца Ігара* (*Відзаўская гарпасялковая бібліятэка*).

4–10 красавіка Тыдзень экалогіі "7 дней с природой" (*Слабодкаўская сельская бібліятэка*).

27 красавіка Гадзіна экалогіі "Эхо нашего безразличия" з удзелам спецыяліста Нацыянальнага парку "Браслаўскія азёры" *Н. Насонавай (дзіцячая бібліятэка)*.

ДУК "Верхнядзвінская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма "

10 сакавіка Сустрэча з членамі літаратурна-музычнага аб'яднання "Литературный ковчег" г. Полацка *С. Чыжовай* і *Р. Цітовай* (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

11 красавіка Сустрэча з былымі вязнямі канцлагераў "Память, неподвластная времени" (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

29 красавіка Семінар бібліятэкараў раёна "Іннавацыйныя формы работы ў абслугоўванні дзіцячага чытача" (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

ДУК "Віцебская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма"

15 сакавіка супрацоўнікі *Акцябрскай сельскай бібліятэкі* прынялі ўдзел у раённым свяце "Мы – грамадзяне Беларусі!", прысвечаным Дню Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

24 сакавіка Прэзентацыя мастацкай выстаўкі прафесара кафедры дызайна ВДУ імя П.М. Машэрава В. Шамшура "Прывітанне, родная старонка!" (*Кіраўская сельская бібліятэка*).

29 сакавіка Сустрэча з са старшынёй Віцебскага аддзялення Віцебскага абласнога аддзялення ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"